Масалёва Т.А.,
студ. ГрДзУ імя Я.Купалы
Навуковы кіраўнік – Сабалеўская В.А.,
канд. культуралогіі, дацэнт

# ПЕРСПЕКТЫВЫ ТУРЫСТЫЧНАГА АСВАЕННЯ ПОМНІКАЎ ДОЙЛІДСТВА ГРЭКА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў ЗАХОДНІМ РЭГІЁНЕ БЕЛАРУСІ

За апошнія дзесяцігоддзі гісторыю ўніі і уніяцкай царквы асвятлялі беларускія гісторыкі, філосафы, філолагі С. Абламейка, М. Гайдук, В. Грыгор’ева, А. Грыцкевіч, Ю. Драгун, У. Кароткі, У. Конан, Ю. Лабынцаў, Л. Лыч, Я. Мараш, С. Марозава, А. Міранові́ч, С. Падокшын, І. Саверчанка, У. Сосна, А. Філатава, М. Хаўстовіч, Л. Царанкоў, В. Цяплова і інш. [3, с.583]. Многія працягваюць праяўляць сваю цікавасць да ўніяцкай царквы і яе ролі ў беларускай гісторыі, але магчымасць выкарыстання помнікаў сакральнай архітэктуры гэтай канфесіі ў турыстычнай сферы застаецца недаследаванай. Між тым, на Беларусі захавалася дастаткова шмат аб’ектаў, якія маюць дачыненне да ўніяцкай царквы. Многія з іх зараз апякуюцца праваслаўнай царквой, але ў той жа час могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы экскурсійных маршрутаў.

«Уніяцкая царква на Беларусі створана ў выніку Берасцейскай уніі 1596 г., калі праваслаўная царква на Беларусі і Украіне арганізацыйна аб’ядналася з рымска-каталіцкай царквой на ўмовах падпарадкавання рымскаму папе і прыняцця каталіцкай дагматыкі пры захаванні праваслаўнай абраднасці» [3, с.583]. Уніяцкая царква садзейнічала захаванню і далейшаму развіццю беларускай мовы і культуры. На працягу XVII-XVIII стст. большасць хрысціян, якія жылі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, належалі да уніяцкай царквы. У другой палове XVIII ст. больш за 80% вясковага насельніцтва былі ўніятамі.

Да помнікаў грэка-каталіцкай царквы ў Заходнім рэгіёне Беларусі мы звяртаемся невыпадкова. Менавіта тут знаходзяцца такія буйныя цэнтры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўніяцкай царквы, як Брэст, Гродна, Пінск, Жыровічы, Ружаны, Быцень, Баруны і інш. Помнікі гэтай канфесіі, якія знаходзяцца ў Заходняй Беларусі, даюць магчымасць прасачыць гісторыю царквы ад самага пачатку і да цяперашняга часу. Экскурсійны маршрут «Помнікі грэка-каталіцкай царквы ў Заходнім рэгіёне Беларусі (Брэст – Ружаны – Альберцін – Жыровічы)» дазваляе рэалізаваць гэтую магчымасць. Аб'екты, якія ўключаны маршрут, адносяцца да розных этапаў гісторыі грэка-каталіцкай царквы на Беларусі.

Экскурсія дае магчымась па-новаму паглядзець на помнікі грэка-каталіцкага мастацтва. У межах экскурсій, якія прапануюць турыстычныя фірмы, Жыровіцкі манастыр апісваецца толькі як праваслаўная святыня. Ад царквы Святых Пятра і Паўла, царквы Святога Мікалая, якія знаходзяцца на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці, засталіся толькі падмуркі, таму відавочна, што яны амаль не выкарыстоўваюцца ў якасці аб'ектаў паказу падчас экскурсій, якія праводзяцца па крэпасці. Мястэчка Ружаны хутчэй вядома за кошт палаца Сапегаў, а не Петрапаўлаўскай царквы, у якой захоўваецца абраз "Маці Божая Адзігітрыя". Абраз 1865 г. на дошцы з арыгінальным фонам "Маці Божая Адзігітрыя", якому прыпісваецца захаванне храма ад пажару 5.5.1895 г., што амаль цалкам знішчыў мястэчка [1, с.194-195], ужо больш за стагоддзе з'яўляецца мэтай паломніцтва вернікаў з усёй Беларусі. Гісторыя місіі езуітаў усходняга абраду ў Альбярціне каля Слоніма выклікае ў апошнія гады значную цікавасць сярод гісторыкаў.

Для езуітаў былой Рэчы Паспалітай альбярцінскі кляштар быў адзінай місіяй нелацінскага абраду. Гэтая місія праводзіла шырокую апостальскую і асветніцкую дзейнасць сярод жыхароў Заходняй Беларусі. У Альбярціне захавалася ўніяцкая царква, якая зараз належыць праваслаўным, і крыж, устаноўлены ў памяць пра айцоў-езуітаў усходняга абраду. Як бачым, экскурсійны маршрут «Помнікі грэка-каталіцкай царквы ў Заходнім рэгіёне Беларусі (Брэст – Ружаны – Альберцін – Жыровічы)» адлюстроўвае зусім новы погляд на аб'екты, якія выкарыстоўваюцца турыстычнымі фірмамі пры распрацоўцы тураў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Маршрут можа быць выкарыстаны як ў межах рэлігійнага, так і пазнавальнага турызму. Ён можа зацікавіць вернікаў грэка-каталіцкай царквы і ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі. Апошнім часам да грэка-каталіцкай царквы далучаецца шмат моладзі, для якой маршрут можа стаць добрай нагодай даведацца пра гісторыю сваёй царквы, пра лёс і сучасны стан яе помнікаў. Грэка-каталіцкая царква на Беларусі мае цесныя сувязі з украінскімі грэка-католікамі. На пачатку адраджэння грэка-каталіцкай царквы ўкраінскія святары служылі першыя літургіі, катэхізавалі і хрысцілі вернікаў. На Украіне ў Львове, Івана-Франкоўску атрымоўваюць адукацыю кандыдаты на святароў [2, с.6]. Вернікі грэка-каталіцкай царквы арганізуюць пілігрымкі да ўкраінскіх святыняў, у той жа час украінскія святары, манахі, вернікі прыязджаюць на Беларусь з місійнай дзейнасцю. Такім чынам, прадстаўленую экскурсію можна выкарыстаць у якасці маршрута пілігрымкі для беларускіх і ўкраінскіх вернікаў, а таксама падчас наведвання Беларусі ўкраінскімі святарамі, манахамі, біскупамі, катэхетамі. У апошнім выпадку экскурсанты часцей за ўсё абмежаваны ў часе, таму пажадана выкарыстоўваць толькі асобныя аб’екты маршруту. Прадстаўлены экскурсійны маршрут – гэта спроба аб’ектыўна распавесці пра гісторыю, лёс і сучасны стан грэка-каталіцкай царквы на Беларусі, а таксама пра яе ролю ў гісторыі Беларусі.

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Габрусь,Т.В. Мураваныя харалы: Сакрал. архітэктура бел. барока / Т.В. Габрусь. – Мінск :Ураджай, 2001. – 287 с.

2. Невяроўскі, К. Беларуская Грэка-Каталіцкая Царква : сучасны стан, преспектывы развіцця / К.Невяроўскі // Царква. – 1998. – №2 (17) . – С. 6.

3. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6ст. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.)[ і інш.]. – Мінск : БелЭн. – Т. 6. Кн. 1: Пузыны – Усая, 2001. – 592 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ